# СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

**Асноўныя паняцці:** словазлучэнне, кампаненты словазлучэння, словазлучэнні сінтаксічна свабодныя і сінтаксічна непадзельныя, простыя і складаныя, іменныя (назоўнікавыя, прыметнікавыя, лічэбнікавыя, займеннікавыя), дзеяслоўныя і прыслоўныя, адносіны паміж кампанентамі словазлучэння, віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях (дапасаванне, кіраванне і прымыканне).

**1. Вызначце, ці з'яўляюцца наступныя спалучэнні слоў словазлучэннямі. Адказ матывуйце.**

Трыста сорак чатыры, быў сустрэўся, іх песня, таму што, абапал дарогі, нягледзячы на дождж, прыемныя ўражанні, пяты ад дарогі, настаўнік і вучань, надзвычай прыемна, буду берагчы, стаялі абапал, давайце спяваць, для таго каб, кожны з прысутных, на працягу месяца, у сувязі з падзеямі, дык вось, няхай прыедзе, цікавейшы за суседа, у лесе, самы высокі, адрамантаваў бы, тым часам як, лепей за ўсіх, найменш упэўнена, весела і прыемна.

**2. Выпішыце ў адзін слупок свабодныя сінтаксічныя словазлучэнні, у другі – сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні, у трэці – несвабодныя фразеалагічныя словазлучэнні.**

Большасць людзей, мусіць прызнацца, сумленны чалавек, на дыбкі стаць, пяцёра партызан, кату па пяту, адданасць справе, саткаць з ільну, быў адказным, штосьці нязначнае, хуткае вызваленне, макам сесці, зрабіць сумыслу, з розуму звесці, сама справа, пачаў злавацца, (чалавек) гадоў пад сорак, пісаць пяром, душа ў душу, не чуць ног пад сабою, сусед па парце, хата лесніка, за адным скрыпам, давесці да торбы, ні жывы ні мёртвы, засталося двое, (хлопец) з блакітнымі вачыма, брэх сабакі, бераг ракі, з усяго маху, выйшлі пакатацца, хтосьці з нас, здавалася блакітнай, трынаццаць чалавек, кожны з нас, кінуў гуляць, хоць гаць гаці, языком малоць, лягчэйшы за ўсіх, дэпутат думы, адказны перыяд, стала сумна, шмат людзей.

**Растлумачце, чым кіраваліся пры размежаванні словазлучэнняў. У свабодных і сінтаксічна непадзельных словазлучэннях абазначце галоўны і залежны кампаненты.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Пабудуйце простыя словазлучэнні з дадзенымі словамі ў ролі галоўнага і ў ролі залежнага кампанентаў. Вызначце від словазлучэнняў паводле марфалагічнага выражэння галоўнага кампанента.**

Радасны, восьмы, весела, гук, вандроўка, сцерагчы, два, горшы, збірацца, хтосьці, кожны, мацнейшы, блізка, смела, барацьба, радасць, вітаць, дуб, адданасць, устаць, паляўнічыя, трое.

**4. Размяжуйце простыя і складаныя словазлучэнні. Абгрунтуйце свой выбар.**

Буду віншаваць сяброў, чуць на свае вушы, нясцерпная туга па Радзіме, прыемная вестка, добрае жаданне, давай прынясём кнігі, няхай чытае самастойна, успамінаць прыемную сустрэчу, складанае заданне для запамінання, самы цікавы фільм, жыць душа ў душу, матылёк з прыгожымі крыльцамі, настойлівы характар бацькі, заўсёды гатовы да подзвігу, новы ўніверсітэцкі корпус, працаваць да сёмага поту, найбольш дакладна прааналізавана, пабачыцца з дачкой і сынам, адчыніць дзверы госцю, сустрэць Новы год, пачаў працаваць сумленна, шчыра хацеў дапамагчы, цагляны дом насупраць, небяспечны з'езд з гары.

**Адкажыце, якія складаныя (аналітычныя) формы слоў могуць быць у якасці кампанента простага словазлучэння.**

**5. Выпішыце са сказаў назоўнікавыя і прыметнікавыя словазлучэнні. Вызначце характар сінтаксічных адносін і від сінтаксічнай сувязі паміж іх кампанентамі.**

1. Міл майму сэрцу гоман далёкі, водгук вясёлы і шум (К-с). 2. Сям-там па нізкіх мясцінах чуліся днём ледзь улоўныя перамовы нябачных яшчэ ручаінак (Лыньк.). 3. І вось пайшлі яе хлопцы зноў, цяпер ужо на ўсход (Б.). 4. Было лета, самая зялёная пара яго (І.М.). 5. Першы снег! Першы снег! Дык хадзем жа хутчэй з гэтых надта ўтульных сягоння пакояў на прастор для душы, на святло для вачэй! Любаваннем з акна не заменіш такое (Гіл.). 6. Горды сцяг перамогі. Кроў братоў і сыноў. Франтавыя дарогі грозных, чорных гадоў (Бр.). 7. Зашчацінены, страшны ад пылу немец нешта крычаў (В.Б.). 8. Мінулае трэба ведаць, каб не заблудзіць у сваім руху наперад (М.Е.). 9. Беднае зярнятка страціла ўжо ўсякую надзею ўбачыць калі-небудзь белы свет: так было цёмна яму ў зямлі (К-с). 10. Палоска лазнякоў месцамі разрывалася, агаляючы светла-жоўтыя пясчаныя выспы (Хадк.). 11. Адзін добры вопыт важнейшы за сем мудрых павучэнняў (Прык.). 12. Ёсць надзвычай непаўторная паэзія ў асеннім полі, хоць на першы позірк здаецца яно пустое і панурае (Шам.). 13. Калі вясна вядзе на луг і нараджае жаданне гарэзліва весяліцца, бегаць, скакаць, а ўлетку цягне паляжаць на ўзлеску, то ўвосень хочацца ісці па палявых дарогах у бяскрайнюю далеч і думаць (Шам.). 14. Брат быў старэйшы за мяне аж на сем гадоў, відаць, таму мы і жылі дружна (Каратк.).

**6. Выпішыце са сказаў лічэбнікавыя і займеннікавыя словазлучэнні. Вызначце характар сінтаксічных адносін і від сінтаксічнай сувязі паміж іх кампанентамі.**

1. Двое з дзяцей засталіся ў лесе назіраць за звяркамі (К-с). 2. Я павінен ведаць, хто з нас на правільнай дарозе і каму ў каго вучыцца трэба (Кр.). 3. Вайна забрала ў Данілавічаў ажно чацвёра сыноў (Парх.). 4. Чуваць першыя для мяне сёлета берасцянкі (Б.). 5. Мы з табою справілі заручыны на зары далёкае пары (Зв.). 6. О зямля! Ты ўся ў абновах! Ты ў мільён званочкаў звоніш, ты на ста пявучых мовах весняй радасцю гамоніш (Гіл.). 7. Як вызначылі спецыялісты, дубу за шэсцьсот гадоў (Хадк.). 8. Сёй-той з прысутных выказваў сваё меркаванне на адносіны да меліярацыі (Скр.). 9. –Вады! – крыкнуў хтосьці з дзяцей (Як.). 10. Кожны з нас крочыў у жыццё самастойна, ведаючы з маленства: ёсць сто дарог – адна твая (Пташ.). 11. Паданне пра Машэку нясе ў сабе і адну з народных версій пра заснаванне і назву горада Магілёва (Ш.). 12. Зусім іншыя патрабаванні былі да нас, хлопчыкаў, у сям'і (К-с). 13. За аднаго бітага двух нябітых даюць (Прык.). 14. Даўняя і штодзённая неабходнасць падоўгу хадзіць па палетках прывучыла яго браць з сабою нешта з яды (Кул.). 15. У зямлянцы пры штабе брыгады жыло іх дзесяць чалавек: дзевяць разведчыкаў і "дзед"(Бр.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**7. Выпішыце са сказаў дзеяслоўныя і прыслоўныя словазлучэнні. Вызначце характар сінтаксічных адносін і від сінтаксічнай сувязі паміж іх кампанентамі.**

1. І што на свеце мілей за цябе, пара маладога жыцця? (К-с). 2. Веснавое сонца растапіла снег на пагорках, пагнала ярамі і зморшчынамі на палях шпаркія ручаі (Хадк.). 3. Ты не гніся, брат, ніколі траўкаю пахілай, сам пружыны сваёй долі выкуй уласнай сілай! (К-с). 4. Я гляджу на сцішанае неба. Дзесьці побач – конікавы строкат. Як жа часам чалавеку трэба апынуцца ў казцы ненарокам! (Гіл.). 5. Між людзей заўжды весялей – не дакучаюць думкі (В.Б.). 6. Асцярожней, таварыш, са святынямі. Чым заменіць іх думаеш, скажы? Страшней за ўсё, як робяцца пустынямі палеткі плодныя людской душы (Гіл.). 7. Чытаць па-руску навучыла яго мама (Бр.). 8. Горача любіць беларус сваю радзіму, сваю зямлю, якую ён багата паіў потам і крывёю (К-с). 9. Алесь ляжаў на ложку і слухаў, як па-асенняму злосна гуў за вокнамі вецер (Бр.). 10. Не ведаю, як каму, а мне асабліва хораша ў асеннім полі (Шам.). 11. Справа ад вёскі цвіла прыгожымі кветкамі-парасончыкамі душанка (К-с). 12. Дзесьці недалёка павінна быць рэчка, гэта, відаць, і было іх

выратаванне (В.Б.). 13. Здаецца ж, дрэў тут блізка няма (Шам.). 14. У глыбіні лесу даволі выразна забліскалі маленькія агеньчыкі. Хто б гэта мог быць? (В.Б.).

**8. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны дапасаваннем. Вызначце формы і сродкі дапасавання.**

1. Нехта незнаёмы нясмела пастукаў у шыбу (І.М.). 2. Як светлы сон, успамінаецца тут матыліная ружовасць пялёсткаў, пчаліны звон і ласкавае сонца (К-с). 3. І стукнула сэрца так моцна ў мяне, аж здрогнуў на ясені месяц-падкоўка (Гіл.). 4. Сонца толькі пачынае сваё шэсце, яно ўжо недзе купаецца промнямі далёка ў лесе (Пестр.). 5. Пяцярым зняволеным загадалі капаць ямы (В.Б.). 6. Два чалавекі ў брызентавых дажджавіках, адзін з аўтаматам, а другі без нічога падышлі да Грыся (Кул.). 7. Толькі цяпер я заўважыў, што бабёр не адзін. Каля яго заварушылася постаць другога бабра (В.В.). 8. Мілы кут мой, ці восень імжыць, ці плыве над табой дзень ласкавы – ты ў мяне пастаянна ў душы, ты – як дзве дарагія мне явы (А.Р.). 9. Гулі маторы. І гэты гул іхні то нарастаў, то заціхаў (Чыгр.). 10. Калі вы далоні злучылі навек, каб крочыць дарогай адною, -- на шчасце, на згоду, як дар-запавет – песню бярыце з сабою! (Гіл.). 11. Пачарнелы зляжалы снег ствараў дрэнны настрой (Нях.). 12. У кутку ляжала трохі ўчарнелага сена і бялела некалькі зжаўцелых паперын (В.Б.). 13. Княгіня Звеніслава спала, звыкла падклаўшы пад шчаку далонь (У.А.). 14. На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам з возерам Мястра (В.В.). 15. Паветра стала цёплым і лагодным, а над далечамі балот і палёў звісла сінеча-смуга (К-с). 16. Усё поле было ўсыпана белымі кветкамі (Ад.).

**Адзначце словазлучэнні з няпоўным дапасаваннем.**

**9. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны кіраваннем. Вызначце формы і сродкі кіравання.**

1. Я радаваўся звароту Кіма. Ён, здавалася, прынёс мінулае, радаснае (І.Н.). 2. Сляпога за правадыра не пашлеш (Прык.). 3. Мы таксама радуемся зелені, сонцу яснаму над галавой, небу сіняму, палям засеяным, шэпту ліўняў з лісцем і травой (Гіл.). 4. Дзецям заўсёды прыемна ад сустрэчы з кнігай (Віт). 5. Перасыльная біржа была вельмі падобнай на лагер ваеннапалонных (Як.). 6. Выратаванне жыцця стала галоўным для Леўчука (В.Б.). 7. Дом і маёмасць падзялілі пароўну з братам (Б.). 8. Высока ў сінім небе плыве яркае сонца, шчодра лье на зямлю сваю цеплыню і святло (І.Н.). 9. Сосен зябкія плечы цішыня спавіла. Мне насустрач здалечы лесам песня ішла (Гіл.). 10. Калі мы пакідалі вёску, бабка выйшла нас праводзіць, а хлапчукі доўга ішлі следам (Нях.). 11. З палёў шырокіх вецярок прыносіць крыштальны звон даспелага калосся (Панч.). 12. Нам кожнаю назвай (вялікай і дробнаю) патрэбна, як імем сваім, даражыць (Панч.). 13 У песні чалавек найбольш поўна выяўляе сваю душу (Крауч.). 14. Перадвераснёўскія дні былі напоўнены прыемнымі клопатамі і хваляваннямі (Шах.). 15. Вушы ловяць церушэнне зор (Лыньк.). 16. Павее ветрык – шурхнуць травы: няма ў ім ласкі, ні забавы (К-с).

**Адзначце словазлучэнні з моцным кіраваннем.**

**10. Выпішыце са сказаў словазлучэнні, у якіх кампаненты звязаны прымыканнем. Вызначце характар сінтаксічных адносін паміж кампанентамі.**

1. На другі дзень Васіля ўпершыню выклікалі працаваць (І.М.). 2. Час ад часу ў вершняку перасвістваюцца каршуны, і ніяк не пасуе ім іх свіст, зусім не маладзецкі і не грозны (Б.). 3. Вага нета – гэта вага без тары і ўпакоўкі. 4. Сцежка дадому бегла вузенькай змейкай праз невялікі хмызняк (Каратк.). 5. Днём грэла зусім слаба (Пташ.). 6. З-пад шэрага паліто выглядвала вайсковая гімнасцёрка і штаны колеру хакі (А.М.). 7. Беларус якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе (Каратк.). 8. Дарога пачала паніжацца, і сыпкі пясок яе змяніўся мяккім падатным забалочаным грунтам… (І.М.). 9. Стары Вежа прытрымліваўся старых звычаяў і загадаў аддаць Алеся на дзядзькаванне да Кагутоў (Каратк). 10. Нас жыццё выпроствала і гнула,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ды зламаць і знішчыць не змагло (Бур.). 11. Яда стоячы не прыносіць ніякага задавальнення. 12 Нас могуць біць – аж да крывавых слёз, каб лёкаяў зрабіць з ахвяраў здзеку, але мы мусім адстаяць свой лёс, каб ён для нас шчаслівы быў давеку (Гіл.). 13. Горача свяціла сонца, зусім па-летняму дрыжала сіняватая смуга над пыльнай дарогай, у кустах крушыны свісталі вясёлыя дразды (І.Н.). 14. І не гасне нястомнае жаданне зазірнуць за заслону заўтрашніх дзён (К-с). 15. Маці, узяўшы капаніцу, пайшла на агарод акопваць бульбу (Сач.). 16. Душа маці прагла ўвабраць у сябе душу свайго народа – яе весялосць і сум, яе радасць і гора (Віт.).

**Адкажыце, чым выражаны залежныя кампаненты словазлучэнняў.**

**11. Да словазлучэнняў падбярыце сінанімічныя і запішыце іх.** Сумаваць без маці, вядомы на ўвесь свет, чытаў пяць дзён, сядзеў поруч з сябрам, нахіліцца да зямлі, схуднець ад гора, бегчы ля хаты, працаваць да самай раніцы, прыехаць адпачыць, не спаць ноччу, часопіс за верасень, ветлівы з бацькамі, паехаць у грыбы, вучыцца на настаўніцу, сустрэцца пасля вячэры, купіць бочку пад капусту.

**12. Выпішыце з тэксту словазлучэнні і дайце ім поўную характарыстыку ў наступнай паслядоўнасці: 1) пачатковая форма словазлучэння (па пачатковай форме галоўнага слова); 2) простае ці складанае; 3) тып словазлучэння паводле спаянасці кампанентаў: свабоднае, сінтаксічна непадзельнае, несвабоднае; 4) сінтаксічныя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння: атрыбутыўныя, аб'ектныя, акалічнасныя (з указаннем значэнняў), суб'ектныя; 5) тып словазлучэння паводле граматычнага выражэння галоўнага слова: іменнае (назоўнікавае, прыметнікавае, лічэбнікавае, займеннікавае), дзеяслоўнае, прыслоўнае; 6) від сінтаксічнай сувязі паміж кампанентамі: дапасаванне (поўнае ці няпоўнае), кіраванне (прыназоўнікавае ці беспрыназоўнікавае, моцнае ці слабае), прымыканне.**

Два тыдні ішлі няспынныя дажджы. Дарогі раскіслі, па іх цяжка было праехаць. Палі, паплавы панабракалі вільгаццю. Вада чвякала пад нагамі, зацякала за каўнер, зябкімі поцекамі прабіралася па спіне і змочвала да апошняй ніткі. Пасля надышлі замаразкі. Яны ўсё мацнелі і мацнелі, і ўжо раніцамі зямля адзывалася пад нагамі лёгкім звонам, і кожны крок быў чуваць за некалькі кіламетраў па ўсім наваколлі. Пасыпаў снег спачатку спакваля, потым пачаў ісці так густа, што адразу на валунах з'явіліся белыя шапкі, а над малымі бярозкамі хутка з'явіліся снежныя шатры. Лес адразу напоўніўся новымі зімовымі галасамі, упрыгожыўся новымі фарбамі.

Хутка над лясамі і палямі загула завея, надзімаючы першыя, невысокія яшчэ і доўгія, як каснікі, сумёты, у якіх яшчэ больш пяску, чым снегу.

Паводле М. Лынькова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Заданні для самастойнай працы

**1. Спішыце сказы. Падкрэсліце ў іх граматычную аснову. Выпішыце са сказаў свабодныя словазлучэнні, абазначце галоўны і залежны кампаненты.**

**Варыянт 1**

1. Камандзір роты быў адным з тых, хто разам з Тураўцом ствараў брыгаду (І.М.). 2. Частуе Крот церпкім ад кіслых хлебных скарынак бярозавікам (І.Н.). 3. Вада ў Сожы выцвіла, памялела і так аддалілася ад берага, што рэдка хто з хлапчукоў дастаў яе каменьчыкам (Ракіт.). 4. Ранкамі ў асеннім небе можна пачуць трубныя галасы апошніх жураўоў (І.Н.).

**Варыянт 2**

1. Хтосьці з хлопцаў ступіў крок наперад і гучна спытаў: -- А што тут будзе? (Шыл.). 2. Я тысячу разоў перакананы, што па-сапраўднаму ненавідзіць ворага той, хто

пяшчотна любіць дзяцей, прыгажосць (Віт.). 3. Сосен зябкія плечы цішыня спавіла. Мне насустрач здалечы лесам песня ішла (Гіл.). 4. Дрэва без каранёў не бывае. Ёсць свае карані і ў кожнага з нас (Сач.).

**2. Выпішыце з тэксту словазлучэнні розных тыпаў (простыя і складаныя, іменныя, дзеяслоўныя, прыслоўныя) і з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі і сэнсавымі адносінамі паміж кампанентамі. Зрабіце поўны сінтаксічны разбор двух словазлучэнняў (на выбар).**

**Варыянт 1**

Ад вёскі, што засталася ў даліне, белае поле ўздымаецца на захад спакваля вышэй, вышэй – аж да самых Балканаў. Такую гучную назву далі гэтым узгоркам, відаць, у мінулым стагоддзі, калі нашы дзяды вярнуліся з-пад Плеўны…

Думаю пра гэта, ідучы па іскрыстым, хрусткім снежным цаліку. Сям-там, вельмі ўжо рэдка, стаяць спрадвеку цярплівыя дзікія грушы. Кусты шыпшыны трапляюцца на схілах яраў ды на ўзлобках, ніколі не араных, падобных на агромністыя боханы. У калючым сярэбраным голлі яшчэ ўсё трымаюцца таксама заінелыя зморшчаныя ягады. Як светлы сон, успамінаецца тут матыліная ружовасць пялёсткаў, пчаліны звон і ласкавае сонца… Надзвычай ярка вырысоўваецца ваўчыны след. Двое шэрых прамчаліся над абрывам і спусціліся ў яр, грузнучы на глыбейшым незаскарынелым снезе.

Высока на поўдні – пакуль што няспелы акраец месяца. Спачатку, пакуль ідзеш, толькі як быццам адчуваеш яго прысутнасць над сабой, а потым так і не вытрываеш – азірнешся ўгару. З нейкай дзіцячай прыемнасцю.

Паводле Я. Брыля.

**Варыянт 2**

Самай адметнай рысай у творчасці і ў жыцці Кузьмы Чорнага была шчодрасць. Шчодрасць на мастацкую самааддачу, шчодрасць на ўражанні, і адсюль – шырыня і смеласць яго задумы. І яшчэ быў ён шчодры на пахвалу другому пісьменніку. Ён не ведаў над сабой хваравітай і ўчэпістай улады зайздрасці. Як кожны сапраўдны пісьменнік, ён адчуваў і разумеў, што ў літаратуры ніколі не будзе цесна талентам; цесна тым, хто становіцца ў чаргу па лаўры. Праца пісьменніка – цяжкая праца, і той, хто як мае быць спраўляецца з ёю, варты павагі. Майстра заўсёды ацэніць роўнага сабе. Ён ведаў, што ў літаратуры перамагае толькі чалавечае, а фальш, пустазвонства, бяздумная даніна чарговай модзе, колькі б яны ні прэтэндавалі на жыццё ў слове, на ўвагу сучаснікаў ці нашчадкаў, урэшце будуць названыя сваімі імёнамі.

М. Стральцоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**3. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Складзіце з некаторымі (на выбар) сказы. Адзначце асаблівасці беларускіх формаў.**

**Варыянт 1**

Болен гриппом, видел своими глазами, писать по адресу, смелее брата, сидеть за чашкой чаю, два долгих года, читать про себя, в двух шагах от деревни, смеяться над другом, ходить по коридорам, пойти за грибами, платок матери, отказаться от прошлого, разжиться деньгами, определить по вкусу, друг по институту, дедушке – около семидесяти, ориентироваться по солнцу, благодарить людей, сбегать за учебником, смеяться про себя, шуточки надо мной, следить за собой, похожий на брата, испытать беду, жить с родителями, заведующий садом, дом в два этажа, увидеть сквозь туман, мне болит голова, в другой раз, рассказывать об отце, заботиться о детях, говорить о своих проблемах, сорок три рубля, тридцать два года, споткнуться о пень, ехать по лесу, ухаживать за больным, стоять около двери, простить ему.

**Варыянт 2**

Дивиться роскоши, сходить за хлебом, жить ради себя, смеяться про себя, бегать по аудиториям, сестре – около девятнадцати, ориентироваться по солнцу, опоздать из-за

снега, забыть обиды, дом отца, отказаться от прошлого, уехать в лес за ягодами, оба соседа, приехать через год, писать по адресу, слышал своими ушами, болен оспой, быстрее звука, жениться на Насте, прийти после обеда, сидеть за чашкой чаю, три прекрасных цветка, в пяти верстах от города, отрекаться от родственников, два раза в месяц, споткнуться о пень, смеяться над неудачами, определить по вкусу, отблагодарить человека, увидеть сквозь туман, послать за сестрой, заботиться о родителях, испытать беду, следить за собой, заведующий кафедрой, избавиться от недостатков, три последних месяца, не спать по ночам, лететь по воздуху, чемпион по хоккею, бежать по снегу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ